ГОД ВЫДАН. III. Przesyłka pocztowa opłacona ryczałtem ЦАНА 30 ГРОШ.

Маланка

ЧАСОПІСЬ ГУМАРУ, ЖАРТАЎ І САТЫРЫ

20. II. 1928 „МАЛАНКА" СМАЛІЦЬ ШТО ДВА ТЫДНІ! № 2

Перад выбарамі.



Прэч з дарогі, абібокі, **Беларусь** ідзе!



ПРЭЧ!

Бура рве і стогнуць нетры
Зямлі маці. У паветры
Лемет дзікі вые-плача...
Гэй, братко мой, небарача,
Селянін!—глянь, ёсьць тут штосьці:
То к табе вун пруцца госьці;
Спраў мандатных ягамосьці,
То табе вун чорна зграя
Зноў, рай, неба абяцае,
Цешыць словам, цешыць ласкай,
Салаўінай льлецца казкай
Шчырасьць панская сьвятая..

Выйдзі, выйдзі, браце, з хаты
Што ім трэба, запытай ты?
Што ім трэба, юдам, здрайцам,
Сьлёз тваіх, твайго жабрацтва?
Твайго ліха, твайго гора?
Дзе-ж былі вы, здрайцы, ўчора?!.
Дзе? — Далёка, ой, далёка!
Ад сялянскіх бедаў — вока,
Пад звон чарак, крыку, мовы
Прапівалі лёс яго вы...
Сяньня зноў зайшла патрэба..
Прэч! Нікога нам ня трэба!
Прэч гані ад курнай хаты
Паляўнічых на мандаты.
Пакажы ўсяму ты сьвету,
Што ты сам дасягнеш эты,
Ўласных сіл агнём, запалам,
Сіл, якіх у нас нямала!!!

М. Васілёк




Асьцярожней, агітатар,
Покуль грошы ды мандат той,
Покуль зловіш на вуду нас.
Каб ня нюхаў кулака нос.

— Так пяюць, я чуў, сяляне...
Хто-ж пярэчыць таму стане?

М. В.

Каля памятніка

(У МАСКВЕ).



— Да чаго слаба на вочы стала: „цара-батюшку“ на памятніку ня бачу!

ПЕРШАЯ ПРЫКМЕТА.

— Кажуць, што ты хутка будзеш мець мужа?

— Магчыма, бо ўжо дзіця маю.

М.

МАЎЧЫ, ДУРНЮ!

— Скажы, мамачка, што гэта такое фашысты?

Гэта — такі чалавек, які хоча ўсім кіраваць, ня дбаючы аб волю другога.

— Ага, разумею, гэта так як мама з таткам...

Маўчы, дурню!..

НА ЛЕКЦЫІ ФІЗЫКІ.

Настаўнік: Кудуніч, дай прыклад выпукатага люстра.

Вучань: Ваша лысіна, пане настаўнік.

ПАМІЖ НАРАЧОНЫХ.

— Бойся Бога, Ўладак, за тыдзень наша вясельле, а ты да карчмы ідзеш!

— Нічога, ня бойся! Вярнуся хутчэй як за тыдзень.

Выбарны календар.

Нядзеля: Спадара — мучальніка беларускай мовы.

***

Панядзелак: Антаніны — прыслужніцы.

***

Аўторак: Язэпа — хрысьціцеля Ярэмы.

***

Серада: Вячэслава — „блажэннага“.

***

Чацьвер: Адама — бога хадэцкага.

***

Пятніца: Франука — паноў угодніка.

***

Субота: Трох братоў Каляды, Валынца і Чатыркі — на „спадарову“ веру цудоўна навернеyных.

ВОСЬ ДЫК ДАЎ.

— Надовечы на мяне напаў Лявон, дык я яму даў... Вось дык даў!

— А чаму ў цябе валасы павырываныя?

— А, братачка, ледзь уцёк...

Я.


ФАМІЛЬНЫ ПАЛАЦ.

— Я хоць не магнат, а фамільны палац маю!

— Які?

— А вастрог у Беластоку. Там бацька мой сядзеў, я і яшчэ двох братоў

Вы „крестьяне“ ў вус ня дуйце Ха „Р. Н. О“ галасуйце!



„Разлука ты, разлука,—
„Чужая старана!...
На сэрцы гора-мука,
Адно „спасенье“ в „Р.Н.О.“!

„*За нами-же крестьяне*“,
За матушку—за Русь!
Вас чмуцяць... Што за слова
Такое: „*Бѣлорусь*“!?

В „Еди-ой—недѣлимой“ —
Ўся сіла наша й „*мочь*“,
А з выдумкамі часу,
З чужым „*нарѣчьемъ*“ *прочь!*

Што можа прыгажэй быць
(*По-русски говоря*),
Як зноў мы вам здабудзем
„*Корону и царя*“!...

Ярома толькі здрадзіў,
Ўжо з намі не пайшоў...
Жыды і немцы болей
Засыпалі грашоў...

Нядаўда-ж пры выборах,
Аж пакуль будзе жыць,
Ён кляўся верай, праўдай
Нам лёкаем служыць!

Ды хай мужык ня дрэміць,—
Падасьць голас за „РНО“;
Ў падзяку лад той вернець
З „*нагаечкай*“—адно!

„*За намі-же, крестьяне*,
За матушку—за Русь!
За вѣру, царя-батюшку—
Плевать на Бѣлорусь!...

М. Васілёк.

На вуснах не абсохла.



— Вось усе кажуць пра неахайнасьць.. Вучэцеся культурнасьці.. Бярэце прыклад ад Эўропы... А на які чорт нам Эўропа? Мы гэтым Эўропам заўсёды нос выцерці можам.

(З рад. в. гумару).

НАША ПОШТА.

Язэпу Народніку: У вершы сваім Вы пішаце:

...У дзяўчыны стан прынадны,
Ен уводзіць із сабой.

Чаму толькі стан? — А дзе рукі, ногі, галава? Адказ тэлеграмай.

А. Чупрыне: Прачытаўшы Вашы жарты, наш рэдактар захварэў на расстройства нэрваў і цяпер яшчэ лечыцца ў шпіталі. Вось да чаго давялі Вашы жарты! А што-б было з нашымі паважанымі падпісчыкамі, калі мы зьмясцілі ў „Маланцы" Вашы, як Вы іх называеце, „жарты".

М. Ліпскаму: Вы прыслалі нам свае вершы і пытаецеся, колькі грошай плоцім мы за кожны радок надрукованага вершу.

За такія вершы, як Вашы, мы ня толькі за радок, але і за цэлы пуд нічога не заплацім.

Ю. Сергіеўчу: Ня крыўдуйцеся моцна на нас, што вашы вершы і на гэты раз сьвету ня ўбачаць. Трэба Вам часьцей пісаць, але карацей і больш выразьней.

Адказ Вам быў зьмешчаны ў № 10 „Маланкі" (Наша пошта).

М. Сушко: У нашага рэдактара не хапае слоў, каб належна ацаніць Вашыя пясьнярскія здольнасьці. Шкадуючы месца, даем толькі невялічкую (але затое найлепшую) частку з Вашага вершу: „Багатая дзяўчына", хай нашыя падпісчыкі і Вашы суседзі даведаюцца, які вялікі пясьнярскі талент марнуецца на нашай Беларусі.

Каб не папсаваць Вашага вершу, стылю і орфографіі, падаем як у арыгінале:

«... Сталі вочы як у рака
Венкі як у зубра
«Стала злосна як сабака
А зубы гострыя, як у бубра.
«Рот шырокі
Аз да ушэі
«Хоць ты шнуроўкі
Тоўстыя прышэі.
Борода аз да грудзеі
«Тоўсчыні на половіну аршына
«Хоць ты везі да Амерыканскіх музеі
«А потым да Бэрлін »...

І даў-жа Бог чалавеку такое натхненьне! Ды Вы з сваім талентам Купалу і Коласа за пояс заткнуць можаце!

К. Лабунку: Вы прыслалі нам вершы і ў лісьце сваім пішаце: „Калі мае вершы няпрыгодныя, — кіньце іх у кошык". Добра, што вы далі нам добрую раду, бо мы ня ведалі, што з імі рабіць (у „Маланку" няпрыгодныя).

Волю Вашу выканалі, якнайлепш, — вершы ў кошык кінулі вельмі старанна.

Кнышу: Калі хочаце супрацоўнічаць у нашым аддзеле „Сьвежыя Навіны", дык падавайце які небудзь камічны факт, які праўдзіва меў месца, прычым падпісвайце сваім імем і прозьвішчам і адрэс (які будзе трымацца ў сэкрэце).

Я. Ласуну: Верш Ваш „Два каханьні" пайшоў у кошык. Тое самае зробім і з Вашым трэцьцім каханьнем, калі ў ім ня будзе гумару. Лепш ня прысылайце.

Міколе К—ку: Вы прыслалі нам свае „творы" і пішаце, што гэта — „вершы". Наш рэдактар гэтаму не паверыў; прачытаў і, падумаўшы, што гэта якая-небудзь чаўпня, кінуў іх у кошык. Гэтак сьвет і не пабачыў Вашых „вершаў"!

К. Сьвет... Яз. Пяткуну, Яз. Народніку, Юліку Сергіевічу, Івану Барану, Якубу, Уладзіку К. — За Вашыя вершы і жарты шчыра дзякуем. Разглядацца будуць пры рэдагаваньні чароднага нумару „Маланкі".

Адрэс Рэдакцыі і Адміністрацыі:
ВІЛЬНЯ, Гэтманская вул., № 4
«МАЛАНКА»



ПАДПІСНАЯ ЦАНА:

на 1 год 8 злот.
„ паўгода 4 „
„ тры мес. 2 „
„ адзін м. 1 „

За граніцу: на год — 2 даляры, на паўгода — 1 д. на 3 мес. — 50 цэнт.

Рэдактар **М. Луцэвіч**. — Выдавец **Я. Маразовіч**. Друкарня Б. Клецкіна, Вільня.